ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.11.2023 № 363

# Вучэбная праграма
# факультатыўных заняткаў «Гісторыя Беларусі: абагульняючы курс»
# для IX класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму базавай адукацыі

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Гісторыя Беларусі: абагульняючы курс» (далей – вучэбная праграма) прызначана для IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму базавай адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 34 гадзіны (1 гадзіна на тыдзень). Вучэбны матэрыял структураваны па тэмах. Педагагічны работнік мае права пераразмеркаваць колькасць гадзін на вывучэнне тэм у межах названых гадзін.

3. Мэта – падрыхтоўка вучняў да выніковай атэстацыі па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

4. Задачы:

паўтарэнне, абагульненне і сістэматызацыя ведаў па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да пачатку XXI ст.;

удасканаленне агульнавучэбных і спецыяльных (прадметных) спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

пашырэнне вопыту самастойнай работы з гістарычнымі крыніцамі розных відаў і тыпаў;

прымяненне ведаў для рашэння вучэбных і жыццёвых задач.

5. Рэкамендаваныя формы і метады навучання: формы, сродкі і метады навучання ў максімальнай ступені накіраваны на развіццё самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Факультатыўныя заняткі прызначаны, галоўным чынам, для ўдасканалення прадметных спосабаў дзейнасці, таму асноўны акцэнт варта зрабіць на практычнай рабоце з гістарычнымі дакументамі, картаграфічнымі (статыстычнымі, выяўленчымі, схематычнымі) матэрыяламі, дыяграмамі, табліцамі.

6. У працэсе засваення зместу дадзенай вучэбнай праграмы вучні павінны:

6.1. ведаць :

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі са старажытных часоў да пачатку XXI ст.;

азначэнні асноўных гістарычных паняццяў;

імёны палітычных дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры Беларусі, вынікі іх дзейнасці і творчасці;

6.2. умець:

лакалізаваць гістарычныя падзеі гісторыі Беларусі ў часе і прасторы;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі;

характарызаваць і ацэньваць дзейнасць гістарычных асоб;

параўноўваць гістарычныя падзеі і з'явы гісторыі Беларусі па пэўных крытэрыях;

канкрэтызаваць тэарэтычныя вывады і гістарычныя паняцці;

аналізаваць фрагменты гістарычных дакументаў; картаграфічныя (статыстычныя, выяўленчыя, схематычныя) матэрыялы, дыяграмы, табліцы;

выкарыстоўваць фрагменты гістарычных дакументаў; картаграфічныя (статыстычныя, выяўленчыя, схематычныя) матэрыялы, дыяграмы, табліцы як самастойныя крыніцы інфармацыі для характарыстыкі гістарычных падзей, з'яў, асоб.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ
## IX клас (34 гадзіны)

### Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. (6 гадзін)

Фарміраванне насельніцтва беларускіх зямель са старажытных часоў да Ранняга сярэднявечча. Засяленне тэрыторыі Беларусі. Заняткі старажытных людзей. Удасканаленне прылад працы і спосабаў гаспадарання. Пераход да вытворчай гаспадаркі. Старажытнейшыя вераванні і культы. З'яўленне славян і іх рассяленне на тэрыторыі Беларусі. Саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі. Узмацненне княжацкай улады. Заняткі і вераванні старажытных славян.

Першыя дзяржавы на беларускіх землях. Перадумовы ўтварэння Полацкага княства. Полацкая княжацкая дынастыя. Полацкая зямля ў перыяд раздробленасці. Узнікненне Тураўскага княства. Адносіны Турава з Кіевам. Гаспадарчае жыццё беларускіх зямель у X – першай палове XIII ст. Узнікненне гарадоў. Развіццё рамяства і гандлю. Абавязкі насельніцтва.

Хрысціянізацыя беларускіх земляў у X – першай палове XIII ст. Прычыны прыняцця хрысціянства. Фарміраванне царкоўнай арганізацыі і распаўсюджанне хрысціянства. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы: Еўфрасіння Полацкая і Кірыл Тураўскі. Значэнне прыняцця хрысціянства. Уплыў хрысціянства на развіццё культуры.

Утварэнне Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст. і з'ўленне крыжакоў ва Усходняй

Прыбалтыцы. Мангольскае нашэсце і беларускія землі. Прычыны ўтварэння ВКЛ. Барацьба за ўмацаванне дзяржавы. Міндоўг – першы кіраўнік новай дзяржавы. Шляхі ўключэння ўсходнеславянскіх земляў у склад ВКЛ. Роля беларускіх земляў у новай дзяржаве.

ВКЛ у XIV–XV стст. Палітыка Гедыміна і Альгерда. Барацьба Давыда Гарадзенскага і Андрэя Полацкага з нямецкімі рыцарамі. Крэўская унія і яе наступствы. Вялікая вайна і Грунвальдская бітва, яе вынікі і гістарычнае значэнне. Унутраная і знешняя палітыка Вітаўта. Дынастычная вайна пасля смерці Вітаўта і яе вынікі. Змены ў сістэме дзяржаўнага кіравання.

Практычныя заняткі.

Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст. (6 гадзін)

Утварэнне Рэчы Паспалітай. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінскі сойм. Становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Намаганні ВКЛ па захаванні самастойнасці. Статут ВКЛ 1588 г.

Гаспадарчае развіццё беларускіх земляў у XVI–XVIII стст. Сельская гаспадарка. «Устава на валокі» 1557 г. і яе рэалізацыя. Вынікі рэформы. Афармленне прыгоннага права. Феадальныя павіннасці. Сацыяльныя канфлікты. Развіццё гарадоў. Рамяство. Цэхі і гільдыі. З’яўленне мануфактурнай вытворчасці. Унутраны і знешні гандаль.

Рэфармацыя і Контррэфармацыя на беларускіх землях. Пачатак рэфармацыйнага руху на беларускіх землях. Асноўныя напрамкі Рэфармацыі і яе вынікі. Контррэфармацыя і яе вынікі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. і яго рашэнні. Вынікі і наступствы заключэння уніі.

Палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай. Падзелы Рэчы Паспалітай. Першы падзел Рэчы Паспалітай. Спробы рэформ у Рэчы Паспалітай. Дзейнасць чатырохгадовага сейма, яго рашэнні. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Паўстанне 1794 г. на беларускіх землях. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.

Культура беларускіх земляў у XVI–XVIII стст. Фарміраванне беларускай народнасці. Паходжанне назвы «Белая Русь». Распаўсюджванне Адраджэння (Рэнесансу) і яго праявы ў культуры. Францыск Скарына – беларускі першадрукар, гуманіст і асветнік. Літаратура і кнігадрукаванне. Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі і навуковых ведаў. Жывапіс і архітэктура. Грамадска-палітычная думка. Уплыў Асветы. Тэатр і музыка.

Практычныя заняткі.

Гісторыя Беларусі, XIX – пачатак XX ст. (6 гадзін)

Беларускія землі пасля ўключэння ў склад Расійскай імперыі. Айчынная вайна 1812 г. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне далучаных да Расіі земляў. Змяненні ў становішчы саслоўяў. «План Агінскага». Баявыя дзеянні летам 1812 г. Палітыка французскіх улад і ўзаемаадносіны з мясцовым насельніцтвам. Становішча насельніцтва Беларусі ў час вайны. Выгнанне напалеонаўскай арміі. Вынікі вайны для Беларусі.

Эканамічнае развіццё беларускіх земляў у XIX – пачатку XX ст. Сельская гаспадарка і становішча сялян у першай палове XIX ст. Рэформы П. Дз. Кісялёва. Ажыццяўленне сялянскай рэформы 1861 г. і яе асаблівасці на беларускіх землях. Развіццё капіталістычных адносін у вёсцы пасля адмены прыгоннага права. Сталыпінскія рэформы ў Беларусі: прычыны і мэты, асноўныя мерапрыемствы, асаблівасці правядзення, вынікі і значэнне. Прамысловасць і стан гарадоў, развіццё гандлю, фінансаў, транспарту ў XIX – пачатку XX ст.

Рэвалюцыйныя рухі на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст. Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі і яго наступствы. Дзейнасць народніцкіх арганізацый. Распаўсюджванне марксісцкай тэорыі. Афармленне палітычных партый. Прычыны, пачатак і ход рэвалюцыі 1905–1907 гг. Маніфест 17 кастрычніка і яго наступствы для Беларусі. Курлоўскі растрэл. Вынікі рэвалюцыі 1905–1907 гг.

Культура Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Фарміраванне навуковых ведаў аб Беларусі і беларускім народзе. Развіццё адукацыі. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры. Асаблівасці фарміравання беларускай нацыі. Роля газеты «Наша ніва» ў развіцці нацыянальнага руху і культуры Беларусі. Афармленне беларускай нацыянальнай ідэі. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Жывапіс, музыка, архітэктура.

Першая сусветная вайна і Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі. Прычыны вайны, мэты бакоў, якія ваююць. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Акупацыя заходняй часткі Беларусі і палітыка германскіх улад. Наступствы вайны для беларускіх земляў. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі. Звяржэнне самадзяржаўя. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Беларускі нацыянальны рух.

Практычныя заняткі.

Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. (15 гадзін)

Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі і фарміраванне нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці. Рэвалюцыйныя падзеі на беларускіх землях. Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні. Першыя спробы ўтварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы. Брэсцкі мір і яго наступствы для Беларусі. Стварэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Савецка-польская вайна. Рыжскі мірны дагавор і яго ўмовы. Удзел Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (далей – БССР) ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (далей – СССР). Узбуйненне тэрыторыі БССР.

БССР у 1920–1930-я гг. Пераход да новай эканамічнай палітыкі (далей – нэп). Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі ва ўмовах нэпа. Прычыны, асаблівасці і метады правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Вынікі прамысловага развіцця БССР у гады першых пяцігодак. Прычыны, метады і асаблівасці правядзення суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР. Вынікі калектывізацыі ў БССР да канца 1930-х гг.

Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР 1920–1930-я гг. Беларусізацыя як састаўная частка савецкай нацыянальнай палітыкі: асноўныя мерапрыемствы і вынікі. Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі і навукі ў БССР. Станаўленне беларускага савецкага мастацтва. Архітэктура.

Палажэнне ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Заходняя Беларусь у складзе Польшчы. Сацыяльна-эканамічная і нацыянальная палітыка польскіх улад на беларускіх землях. Нацыянальна-вызваленчы рух. Дзейнасць беларускіх палітычных партый і арганізацый. Культура Заходняй Беларусі.

Пачатак Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Сацыялістычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР. Напад нацысцкай Германіі на СССР. Абарончыя баі ў Беларусі і іх значэнне. Гераічнасць і самаадданасць абаронцаў Айчыны.

Германскі акупацыйны рэжым, партызанскі рух і падпольная барацьба ў Беларусі. Устанаўленне «новага парадку». Палітыка генацыду: канцэнтрацыйныя лагеры і лагеры смерці, гета. Карныя аперацыі. Дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Партызанскія зоны. «Рэйкавая вайна». Падпольная барацьба. Супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму.

Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Пачатак вызвалення Беларусі. Беларуская наступальная аперацыя «Багратыён» і яе вынікі. Людскія

і матэрыяльныя страты Беларусі. Ураджэнцы Беларусі на франтах вайны і ў савецкім тыле. Значэнне і вынікі дзейнасці партызан і падпольшчыкаў на тэрыторыі Беларусі. Беларусь – адна з краін-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (далей – ААН). Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа.

Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг. Асаблівасці пасляваеннага ўнутрыпалітычнага жыцця ў БССР. Змены ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 50-х – першай палове 60-х гг. ХХ ст. Удзел насельніцтва БССР у грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. Роля Камуністычнай партыі Беларусі. Палітыка перабудовы ў БССР. Фарміраванне шматпартыйнасці.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг. Пераадоленне наступстваў вайны. Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Аднаўленне і развіццё сельскай гаспадаркі. Умовы і ўзровень жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва. Запаволенне тэмпаў росту эканомікі і сацыяльнай сферы і спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС і яе наступствы для Беларусі.

Развіццё культуры ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг. Развіццё сістэмы народнай адукацыі. Дасягненні навукоўцаў – ураджэнцаў Беларусі. Адлюстраванне гістарычных падзей у творах беларускай савецкай літаратуры. Рэпертуар беларускіх тэатраў. Беларускі жывапіс. Беларускае кіно. Музычная творчасць.

Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі і грамадска-палітычнае развіццё Рэспублікі Беларусь. Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР (27 ліпеня 1990 г.). Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка 1994 г.). Увядзенне пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рэспубліканскія рэферэндумы 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г., 27 лютага 2022 г., прынятыя на іх змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь. Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь. Усебеларускі народны сход – вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь. Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. і пошук шляхоў выхаду з крызісу. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця, мэты і сродкі яе рэалізацыі. Знешнегандлёвыя прыярытэты Рэспублікі Беларусь.

Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь. Прынцыпы і шматвектарны характар знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць Беларусі

ў ААН. Стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Умацаванне сувязей Рэспублікі Беларусь з краінамі СНД. Утварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза. Узаемаадносіны Беларусі з Еўрапейскім саюзам і іншымі рэгіёнамі свету.

Развіццё адукацыі і навукі, культуры і спорту Рэспублікі Беларусь. Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі. Дасягненні ў развіцці навукі. Адлюстраванне гістарычнага мінулага і сучаснасці ў творах беларускай літаратуры і мастацтва. Алімпійскія дасягненні спартсменаў Рэспублікі Беларусь.

Практычныя заняткі.

Выніковае абагульненне (1 гадзіна)